# Выкарыстанне сродкаў фальклору для развіцця беларускага маўлення ў дзяцей малодшага дашкольнага ўзросту

*Хворак Таццяна Аляксандраўна*

УА " Брэстскі дзяржаўны ўніверсітэт імя А.С.Пушкіна "

Развіваць у дзяцей беларускае маўленне неабходна менавіта ў малодшым дашкольным ўзросце, які з'яўляецца сензітыўным перыядам актыўнага засваення дзецьмі гутарковай мовы, станаўлення і развіцця ўсіх яе бакоў: фанетычнай, лексічнай, граматычнай. Для гэтага трэба стварыць маўленчае асяроддзе такім чынам, каб яго развіццёвы патэнцыял быў дастаткова высокім для кожнага дзіцяці ў адпаведнасці з узростам.

Выяўлена, што фальклор валодае педагагічным патэнцыялам для развіцця беларускага маўлення ў дзяцей малодшага дашкольнага ўзросту.

Па-першае, творы беларускага фальклора сваім зместам і формай паступова ўводзяць малога ў свет народнага слова, раскрываюць яго багацце і прыгажосць. Яны надаюць жаданне паўтараць пачутае, размаўляць адзін з адным. Далучаць дзіця да гісторыі, мовы, культуры і традыцый роднага краю.

Па-другое, малыя формы дзіцячага фальклору з цікавасю засвойваюцца маленькімі дзецьмі, бо часцей за ўсё іх праслухоўванне суправаджацца абыгрываннем, інсцэніроўкай, далучэннем адпаведных зместу дзеянняў і рухаў (ў тым ліку пальчыкавая гімнастыка). Гэты факт робіць успрыманне і разуменне мовы больш даступным для маленькага слухача, заахвочвае да паўтарэння слоў, выразаў, песень.

З мэтай развіцця беларускага маўлення ў дзяцей малодшага дашкольнага ўзросту намі распрацавана праграма па аптымізацыі працэсу развіцця беларускага маўлення ў дзяцей малодшага дашкольнага ўзросту сродкамі фальклора. Якая дазваляе наладзіць працэс развіцця беларускага маўлення эмацыянальна пад час заняткаў і рэжымных момантаў, развіваць беларускае маўленне сродкамі фальклору, пазнаёміць дзяцей з малымі творамі беларускага фальклора, узбагачаць і замацоўваць актыўны слоўнік дзіцяці на аснове ведання малых фальклорных твораў і ўяўленняў пра навакольнае жыццё, разумець ўсведамлёна значэнне слоў.

Для рэалізацыі праграмы намі праведзена праца па адбору фальклорных твораў, папоўнена прадметнае развіваючае асяроддзе (сканструіраваны настольныя тэатры, тэатр на фланелеграфе; складзена картатэка беларускіх народных гульняў; створана бібліятэка беларускіх народных казак, пацешак, вершаў, загадак, прыказак, прымавак, заклічак, забаўлянак, лічылак). Распрацаваны сцэнарый аднаго дня, дзе пры дапамозе малых форм фальклора пад час рэжымных момантаў развіваецца беларускае маўленне ў дзяцей малодшага дашкольнага ўзросту.

Для праверкі эфектыўнасці распрацаванай праграмы быў праведзены педагагічны эксперымент на базе ўстановы дашкольнай адукацыі.

Для выяўлення ўзроўня развіцця беларускага маўлення ў дзяцей малодшага дашкольнага ўзросту былі распрацаваны дыягнастычныя практыкаванні, якія дазваляюць выявіць ўзровень развіцця беларускага маўлення ў дзяцей не ў прамой форме, а у выглядзе бяседы з элементамі тэатралізацыі, гульні, з выкарыстаннем дыдактычных картак, што дазваляе дастаткова дакладна ажыццявіць дыягностыку кожнага дзіцяці. Яны размеркаваны так, каб у выніку правядзення аднаго з іх, мы атрымлівалі выніковыя данныя па некалькім аспектам маўлення.

Наканстатуючым этапе даследавання было выяўлена, што дзеці малодшага дашкольнага ўзросту не ўмеюць звязна перадаць невялікі па аб’ёму мастацкі тэкст у вызначанай паслядоўнасці і логіцы, не разумеюць значэння беларускіх слоў, не правільна ўжываюць прыназоўнік і назоўнікі ў множным ліку, з памылкамі ўтвараюць назвы дзіцянёў жывёлаў, маюць малы слоўнікавы запас і неправільнае гукавымаўленне. Узровень развіцця беларускага маўлення ў дзяцей малодшага дашкольнага ўзросту ў эксперыментальнай і кантрольнай групах не меў значных адрозненняў на пачатковым этапе даследавання.

Фарміруючы этап праводзіўся з дзецьмі эксперыментальнай групы. Праца строілася на аснове распрацаванай праграмы. Выкарыстоўваліся распрацаваныя сцэнарыі рэжымных момантаў, пад час якіх быў выкарыстаны педагагічны патэнцыял фальклора. Праца вялась ў наступных напамках:

– арганізацыя гульняў з выкарыстаннем малых форм беларускага фальклору,
– прымяненне фальклорных жанраў у працэссе адукацыйнай дзейнасці;
– выкарыстанне фальклорных твораў у рэжымных момантах.

У гэты ж перыяд ў дзяцей кантрольнай групы таксама развівалася беларускае маўленне згодна вучэбнай праграме дашкольнай адукацыі. У адрозненні ад эксперыментальных груп педагог не выкарыстоўваў на працягу ўсяго дня сродкі фальклора.

На кантрольным этапе эксперымента для выяўлення ўзроўня развіцця беларускага маўлення ў дзяцей малодшага дашкольнага ўзросту былі выкарыстаны тыя ж дыягнастычныя практыкаванні, што і на канстатуючым этапе. У выніку статыстычнай апрацоўкі дыягнастычных даных па двум выбаркам (выкарыстоўваўся U крытэрый Мана-Уітні) мы прыйшлі да высновы, што ўзровень развіцця беларускага маўлення ў дзяцей малодшага дашкольнага ўзросту эксперыментальнай групы стаў значна вышэй, чым у кантрольнай.

Такім чынам, фальклор, асабіста яго малыя жанры, з’яўляюцца эфектыўным сродкам для развіцця беларускага маўлення ў дзяцей малодшага дашкольнага ўзросту пры ўмове выкарыстання яго на занятках і на працягу рэжымных момантаў у дзіцячым садзе.